Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»

Кафедра гуманітарных дысцыплін

# ГІСТОРЫЯ
## (гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)

**Метадычныя рэкамендацыі да планаў семінарскіх заняткаў для студэнтаў усіх спецыяльнасцей па абавязковым модулі**

Магілёў
МДУХ
2015

УДК 947.6
ББК 63.2 (4Беи)

Разгледжаны і рэкамендаваны да выдання на пасяджэнні кафедры гуманітарных дысцыплін
Пратакол № 10 ад 24.06.2015 г.

Аўтар-складальнік
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Пушкін І. А.

Рэцэнзент
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Косцераў А. П.

Дадзеныя метадычныя парады да семінарскіх заняткаў па абавязковым модулі “Гісторыя (гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)” прызначаны для студэнтаў усіх спецыяльнасцей МДУХ. На падставе аналізу гістарычных крыніц, апублікаваных прац, вырашэння праблемных і дыскусійных пытанняў грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў студэнтаў павінны сфарміравацца сацыяльна-асобавыя кампетэнцыі, якія забяспечваюць іх самавызначэнне ў сістэме каштоўнасцяў, выпрацаваных падчас гістарычнага развіцця беларускага народа і станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы, і выхаванне на гэтай аснове пачуцця далучанасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

**УДК 947.6**
**ББК 63.2 (4Беи)**

© Установа адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны
ўніверсітэт харчавання», 2015

**Змест**

Прадмова 4

1 Змест праграмнага вучэбнага матэрыялу 7

2 Планы семінарскіх заняткаў 12

Тэма 1 Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу (VI ст. – пачатак XX ст.)

Тэма 2 Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.

Тэма 3 Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917г.)

Тэма 4 Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.)

Тэма 5 Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы

Тэма 6 Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны

Тэма 7 Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945–1991 гг.)

Тэма 8 Рэспубліка Беларусь ў канцы XX – пачатку XXI стст.

3 Планы семінарскіх заняткаў для замежных студэнтаў 17

4 Пытанні для падрыхтоўкі да заліка і экзамена 20

5 Пытанні для падрыхтоўкі да заліка і экзамена для замежных студэнтаў 24

Асноўная літаратура 26

Мультымедыйныя сродкі 26

Вучэбна–метадычная літаратура 26

Дадатковая літаратура 27

Слоўнік тэрмінаў 29

## Прадмова

Актуальнасць вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб'ектыўнага навуковага погляду на гісторыю беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Гэта з'яўляецца абавязковай умовай, якая забяспечвае падрыхтоўку не толькі спецыяліста-прафесіянала, але і фарміраванне ў асобы якасцей грамадзяніна і патрыёта.

Асноўнымі мэтамі выкладання вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя (гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)" ва ўстановах вышэйшай адукацыі з'яўляюцца фарміраванне акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнтаў, забяспечваючых іх асобаснае самавызначэнне ў сістэме каштоўнасцяў, выпрацаваных падчас гістарычнага развіцця беларускага народа і станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы, і выхаванне на гэтай аснове пачуцця далучанасці да лёсу краіны і яе гісторыі; набыццё студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных фактаў і падзей, што забяспечвае фарміраванне сацыяльна-асабовых кампетэнцый студэнта, заснаваных на сістэме каштоўнасцяў, якая сфарміравалася ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і эвалюцыі яго дзяржаўнасці, што з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічнай асновай, неабходнай для якаснай сацыяльна-прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Для рэалізацыі мэтаў, азначаных вышэй, лічыцца неабходным вырашэнне наступных задач:

- фарміраванне ў студэнтаў ведаў і ўменняў аналізу заканамернасцяў і асаблівасцяў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага, духоўнага развіцця беларускага народа з улікам цывілізацыйных характарыстык і выхавання на гэтай аснове пачуцця адказнасці за лёс краіны;
- засваенне студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцяў, якія былі створаны ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і развіццё на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі;
- гатоўнасць выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у аб'ёме сваіх кампетэнцый, сфарміраваных у выніку ўсвядомленага засваення і выкарыстання вучэбнай гістарычнай інфармацыі, садзейнічаць далейшаму развіццю сваёй краіны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі" студэнт павінен:

а) развіць наступныя акадэмічныя кампетэнцыі:

– валодаць і ўжываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
– валодаць даследчымі навыкамі;
– умець працаваць самастойна;

– быць здольным інтэграваць новыя ідэі (крэатыўнасць);
– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;
– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

б) набыць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:
– валодаць якасцямі грамадзянскасці;
– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
– валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;
– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне);
– умець працаваць у камандзе.

Семінарскія заняткі па курсе з'яўляюцца састаўной часткай вучэбнага працэсу. На вывучэнне інтэграванага модуля "Гісторыя" для студэнтаў хіміка-тэхналагічных і механічных спецыяльнасцей вылучаецца 100 гадзін, у тым ліку 34 аўдыторныя гадзіны, з іх 16 гадзін семінарскіх заняткаў і 66 гадзін самастойнай працы студэнтаў (у тым ліку 28 гадзіна на падрыхтоўку да іспыту). Агульная працаёмкасць навучальнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі (3 з.а.).

На вывучэнне інтэграванага модуля "Гісторыя" для студэнтаў эканамічных спецыяльнасцей, 1-36 20 01, 1-48 01 02 вылучаецца 72 гадзіны, у тым ліку 34 аўдыторныя гадзіны, з іх 16 гадзін семінарскіх заняткаў і 38 гадзін самастойнай працы студэнтаў. Агульная працаёмкасць навучальнай дысцыпліны складае 2 заліковыя адзінкі (2 з.а.).

У гэтым метадычным выданні распрацаваны планы семінарскіх заняткаў, тэмы для дыскусій і напісання рэфератыўных паведамленняў, пытнні для залікаў і экзаменаў, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, а таксама слоўнік тэрмінаў. На сучасным этапе неабходна выкарыстоўваць розныя формы правядзення семінарскіх заняткаў. Яны могуць праводзіцца, як у вучэбных аўдыторыях, так і метадам "малых груп", у выглядзе экскурсій па горадзе Магілёву і музеям, наведвання выстаў.

На семінарскіх занятках студэнты, на аснове агульнатэарэтычных ведаў, атрыманых пад час лекцый і самастойнай працы, павінны навучыцца: выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі для характарыстыкі асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага народа; характарызаваць умовы і вынікі складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды; ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі функцыянавання савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця; тлумачыць уплыў асобных культурна-цывілізацыйных фактараў на развіццё Беларусі і ацэньваць асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі; выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну Беларусі ў сваёй прафесійнай дзейнасці і памнажаць яе; аналізаваць працэс складвання беларускай дзяржаўнасці, афармлення і замацоўвання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь; характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у

асобныя гістарычныя перыяды, ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнай глабалізацыі.

У выніку студэнты набудуць навыкі вызначэння агульнагістарычных працэсаў і з’яў гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый; агульнадзяржаўнай талерантнасці; з дапамогай мінулага тлумачыць сучаснасць; самаідэнтыфікацыі і інтэграцыі. Таксама будуць здольныя выкарыстоўваць з’явы з гісторыі Беларусі ў сучаснай эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці, садзейнічаць далейшаму развіццю сваёй краіны.

Вельмі важным пры правядзенні семінарскіх заняткаў і дасягненні поспехаў у фарміраванні кампетэнцый з’яўляюцца арганізацыя самастойнай працы студэнтаў і выкарыстоўванне сучасных метадаў і тэхналогій навучання.

Творчы працэс падрыхтоўкі да семінараў прадугледжвае самастойную работу студэнтаў па вывучэнні і асэнсаванні лекцыйнага матэрыялу, метадычных парад, асноўнай і дадатковай літаратуры па тэмах.

Асноўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў прапаноўваецца: выкананне тэставых заданняў, рашэнне праблемных сітуацый і задач, выкананне творчых заданняў (аналіз навуковых артыкулаў, складанне на іх анатацый, рэцэнзій, рэфератаў; напісанне эсэ; распрацоўка праектаў і інш.).

Правядзенне семінарскіх заняткаў прадугледжвае магчымасць выкарыстання рэйтынгавай формы арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Рэйтынгавая сістэма адзнакі ведаў
па навучальнай дысцыпліне “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі”

| **Віды дзейнасці** | **Колькасць балаў** | **Найбольшая колькасць балаў** |
|---|---|---|
| Наведванне семінарскіх заняткаў | 0,5 | 4 |
| Адказ на семінарскім занятку | да 5 | 25 |
| Дапаўненне да адказу | 1 | 6 |
| Выступ з дакладам | да 5 | 10 |
| Актыўны ўдзел у абмеркаваннях, дыскусіі, гульнях і г.д. | да 3 | 9 |
| Вынікі прамежкавых тэстаў | 3 | 6 |
| Вынікі кантрольнага тэсту | 5 | 10 |
| Напісанне даследчай працы (рэферата) | да 30 | 30 |
| Усяго за семестр | | 70 |
| Адказ на экзамене (заліку) | | 30 |
| У выніку | | 100 |

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання на семінарскіх занятках, якія адпавядаюць задачам вывучэння дадзенага інтэграванага модуля, з’яўляюцца:

1) метады праблемнага навучання (пошукавы і даследчы метады);

2) асобасна арыентаваныя (развіваючыя) тэхналогіі, заснаваныя на актыўных (рэфлексійна-дзейнасных) формах і метадах навучання («мазгавы штурм», дзелавая, ролевая і імітацыйная гульні, дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты, круглы стол, кейс-тэхналогія, праект і інш);

3) інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, якія забяспечваюць праблемна-даследчы характар працэсу навучання і актывізацыю самастойнай працы студэнтаў (структураваныя электронныя прэзентацыі, выкарыстанне аўдыё-, відэападтрымкі вучэбных заняткаў (аналіз аўдыё-, відэасітуацый і інш.), распрацоўка і прымяненне на аснове кампутарных і мультымедыйных сродкаў гістарычных творчых заданняў, дапаўненне традыцыйных навучальных заняткаў сродкамі ўзаемадзеяння на аснове сеткавых камунікацыйных магчымасцяў (інтэрнэт-форум, інтэрнэт-семінар і інш.), наведванне музеяў і інш.

На семінарах выкладчыку і студэнтам рэкамендуецца праектаваць і рэалізоўваць пэўныя педагагічныя тэхналогіі: электронныя вучэбна-метадычныя комплексы; варыятыўныя мадэлі самастойнай працы, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, метад кейсаў, методыкі актыўнага навучання.

Для дыягностыкі сфарміраванасці кампетэнцый студэнтаў варта выкарыстоўваць педагагічныя тэсты і тэставыя заданні; рознаўзроўневыя кантрольныя работы і заданні; рэфераты (даследчыя працы), адзнакі па рэйтынгавай сістэме.

## 1 Змест праграмнага вучэбнага матэрыялу

### Тэма 1 Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя (гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)”

Метадалагічныя асновы вывучэння гісторыі. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Цывілізацыя як стадыя развіцця грамадства і як лакальны культурна-гістарычны тып. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця агульнарускай і еўрапейскай гісторыі. Гістарыяграфічныя школы. Крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.

## Р а з д з е л I
## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРСКІХ ЗЕМЛЯХ

### Тэма 2. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу (VI ст. – пачатак ХХ ст.)

Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Пачатак рассялення славян (VI ст.) і славянізацыя балтаў. Старажытнаруская народнасць як аснова фарміравання рускага, беларускага і украінскага этнасаў.

Паходжанне назвы “Белая Русь” (Беларусь). Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV–XVIII стст. Усходнеславянскі этнічны падмурак Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага (ВКЛ). Роля праваслаўнай царквы ў кансалідацыі беларускага этнасу. Уплыў каталіцтва і уніяцтва. Этнічная самасвядомасць і менталітэт беларусаў. Трансфармацыя ідэнтычнасці і саманазвы беларускага этнасу: рускія, русіны, “тутэйшыя”, беларусы. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX–XVIII стст.

Далейшае развіццё беларускага этнасу ва ўмовах складвання рынкавых адносін у XIX ст. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў. Зараджэнне і развіццё беларусазнаўства. Тэорыя “заходнерусізму”. Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст.

**Тэма 3. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.**

Еўропа ў сярэднявеччы. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях. Кіеўская Русь. Полацкае і Тураўскае княствы і іх узаемаадносіны з Кіевым і Ноўгарадам. Феадальная раздробленасць. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойскага. Роля заходнерускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ Асаблівасці фарміравання дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічннага ладу на беларускіх землях ВКЛ.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гісторыі ў Новы час. Эпоха Адраджэння, Рэфармацыя, Асветніцтва. Развіцце капіталізму. Першыя буржуазныя рэвалюцыі ў Заходняй Еўропе.

Беларускія землі пасля Люблінскай уніі. Уваходжанне ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель. Узмацненне феадальнай анархіі. Паглыбленне крызісу і тры падзелы Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

**Тэма 4. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.)**

Значэнне ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі ва ўмовах фарміравання індустрыяльнага грамадства. Цывілізацыйнае адзінства Беларусі і Расіі. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі. Беларускія землі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г. Польскае паўстанне 1830–1831 гг. і яго наступствы.

Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі. Адмена прыгоннага права. Рэформы 60–70-х гг. XIX ст. і асаблівасці іх здзяйснення на Беларусі. Спецыфіка прамысловага перавароту ў Беларусі Месца эканамікі Беларусі ва ўсерасійскім рынку. Змены ў сацыяльнай струтуры насельніцтва.

Грамадска-палітычныя рухі і аб’яднанні ў Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. яго уплыў на палітыку ўладаў у Беларусі і грамадска-палітычную думку. Ідэалогія лібералізму, народніцкія і сацыял-дэмакратычныя плыні. Узнікненне агульнарасійскіх і беларускіх партый. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і пачатак

расійскага парламентарызму. Сталыпінская афарная рэформа і асаблівасці яе здзяйснення ў Беларусі. Першая сусветная вайна і яе наступствы для Беларусі.

Лютаўская рэвалюцыя і фарміраванне новых улад. Стратэгія і тактыка палітычных партый у адносінах да ўлады, праблемы выбару шляхоў далейшага грамадскага развіцця. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага, палітычнага крызісу ў Расіі і расстаноўка палітычных сіл на Заходнім фронце і ў Беларусі восенню 1917 г. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і ў Беларусі.

## Р а з д з е л  I I
## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І ЎМАЦАВАННЕ ЯЕ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў XX - ПАЧАТКУ XXI СТ.

### Тэма 5. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.)

Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага народа. Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Барацьба супраць германскіх акупантаў.

Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах германскай акупацыі – спроба зацвярджэння беларускай дзяржаўнасці на заходніх парламенцкіх прынцыпах. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Барацьба беларускага народа з польскімі інтэрвентамі. Роля і месца БССР у складзе СССР.

Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Сканцэнтраванне функцый заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў руках дзяржаўна-партыйнага апарата. Дэфармацыі ў грамадска-палітычным жыцці БССР. Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. XX ст. Праблема вызначэння грамадска-палітычнага ладу ў СССР.

Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (асаблівасці нэпа, індустрыялізацыя, калектывізацыя).

Уздзеянне савецкага фактару на фарміраванне беларускай нацыі. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 30-я гг. XX ст. Стаўленне савецкай улады да царквы.

### Тэма 6. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы

Вынікі Першай сусветнай вайны. Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лёсе беларускага народа.

Грамадска-палітычнае, эканамічнае і нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.

**Тэма 7. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны**

Прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі і Германіі. Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў 30-я гг. ХХ ст. Правал палітыкі калектыўнай бяспекі. Пачатак Другой сусветнай вайны. Вызваленне Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму і яго мэты. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцяў Беларусі. Гітлераўскі генацыд народа. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць на карысць акупантаў.

Вызначальныя перамогі Чырвонай Арміі (бітвы пад Масквой, Сталінградам, Курскам), іх уплыў на ўздым партызанскага руху і падпольнай барацьбы. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Пачатак вызвалення Беларусі. Аперацыя “Баграціён”. Завяршальныя пераможныя аперацыі Чырвонай Арміі.

Вынікі вайны для беларускага народа і яго уклад у Перамогу над гітлерызмам. Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны і ў еўрапейскім руху Супраціўлення. Захаванне памяці аб гераізме савецкага народа.

**Тэма 8. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.)**

Геапалітычныя змены на міжнароднай арэне пасля Другой сусветнай вайны. Пачатак “халоднай вайны”. Супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм. Барацьба за мір і разбраенне. Крызіс сусветнай сацыялістычнай сістэмы і яе распад. Заканчэнне “халоднай вайны”.

Аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў першае пасляваеннае пяцігоддзе. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі. Эканамічнае развіццё БССР ва ўмовах пачатку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Эканамічная рэформа 1965 г. і яе вынікі. Спецыялізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР ва умовах адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР. Зніжэнне тэмпаў вытворчасці і нарастание крызісных з’яў у эканоміцы. Палітыка перабудовы, курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Чарнобыльская аварыя і яе наступствы. Паглыбленне эканамічнага крызісу ў СССР і БССР у канцы 80-х гг. ХХ ст.

Грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Барацьба з антысавецкімі групоўкамі. Ідэалагічныя кампаніі і неабгрунтаваныя рэпрэсіі па палітычных матывах другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Асуджэнне культа асобы І.В.Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – 1964 гг. Нарастание кансерватызму ў грамадска-палітычным жыцці ў 1970-я –

першай палове 1980-х гг. Першыя крокі па рэфармаванню палітычнай сістэмы ў гады перабудовы. Змяненні ў Канстытуцыях СССР і БССР. Крызіс савецкага федэралізму, “парад суверэнітэтаў рэспублік”, барацьба за суверэнітэт Беларусі.

Адукацыя, навука і культура БССР у пасляваенны перыяд: дасягненні і праблемы. Дзяржаўная рэлігійная палітыка і становішча канфесій.

**Тэма 9. Рэспубліка Беларусь ў канцы XX – пачатку XXI ст.**

Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР і БССР. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Пачатак фарміравання органаў улады і кіравання рэспублікі на прынцыпах суверэнітэту. Распад СССР і ўтварэнне СНД. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Выбары прэзідэнта і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 і 1996 гг., іх вынікі. Дапаўненні і змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Эвалюцыя “вертыкалі” улады і кіравання.

Крызісны стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў пачатку 90-х гг. XX ст. Стварэнне перадумоў пераходу да рынкавай эканоміцы, напрацоўка прававой базы, вызначэнне метадаў і накірункаў рэфармавання эканомікі. Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця краіны. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі. Сусветны эканамічны і фінансавы крызіс і яго наступствы для краін Усходняй Еўропы. Сучасны стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы Беларусь

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсах. Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь і змены ў знешнепалітычным механізме краіны. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі, яе шматвектарнасць. Беларуска-расійскія адносіны, стварэнне Саюза Беларусі і Расіі. Беларусь і СНД, фарміраванне мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы.

Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне нацыянальнай сістэмы адукацыі. Складанасці навуковай працы, страты і здабыткі беларускай навукі. Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Нацыянальна-дзяржаўная палітыка. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей. Асноўныя накірункі развіцця літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.

## 2 Планы семінарскіх заняткаў

### Тэма 1. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу (VI ст. – пачатак XX ст.)

1 Насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага веку. Рассяленне славян.
2 Асноўныя канцэпцыі паходжання беларускага народа і назвы “Белая Русь”. Фарміраванне беларускай народнасці.
3 Увядзенне хрысціянства. Роля рэлігіі ў кансалідацыі беларускага этнасу.
4 Этнічная самасвядомасць і менталітэт беларусаў. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX–XVIII стст.
5 Развіццё беларускага этнасу ў XIX ст. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў.
6 Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст.

*Пытанне да дыскусіі:*
1 Месца Беларусі ў еўрапейскай гісторыі.
2 Індаеўрапейцы і іх роля ў гісторыі народаў Еўропы.
3 Этнічная аснова беларускай народнасці.
4 Аб праблеме старажытнарускай дзяржаўнасці.

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*
1 Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы ў гістарычным пазнанні.
2 Станаўленне нацыянальнай гісторыяграфічнай канцэпцыі.
3 Вусная народная творчасць – аснова беларускай культуры.
4 Выдатныя дзеячы беларускай культуры X – першай паловы XIII стст.
5 Матэрыяльная і духоўная культура першабытнага грамадства.
6 Роля і значэнне грэка-каталіцкай (вуніяцкай) царквы ў гісторыі і культуры беларускага народа.
7 Фактары фарміравання беларускай нацыі.

*Літаратура:* [1, с. 4-19, 28-36, 56-59, 151-154; 2, с. 16-44, 111-118, 234-243; 3, т. 1, с. 17-41, 128-155, 369-391; 4, с. 3-18, 36-44, 170-188: 6, т. 1, с. 9-91, 166-177, 192-200, 329-356; 7, с. 4-23; 8, с. 5-55, 99-116, 179-183, 217-224; 9, ч. 1, с. 7-37, 53-56, 104-125; ч. 2, с. 41-60; 10; 21].

### Тэма 2. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.

1 Станаўленне раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі. Полацкае і Тураўскае княствы ў IX–XIII стст.
2 Перадумовы і працэс фарміравання Вялікага Княства Літоўскага. Асаблівасці фарміравання дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічннага ладу на беларускіх землях ВКЛ.

3 Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай. Беларускія землі пасля Люблінскай уніі.
4 Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай. Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для Беларусі.
5 Асноўныя тэндэнцыі і дасягненні ў развіцці культуры Беларусі ў эпохі Адраджэння, Рэфармацыі і Асветніцтва.
6 Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII–XVIII ст. Прычыны крызісу і тры падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі.

*Пытанне да дыскусіі:*
1 Полацкае княства – выток беларускай дзяржаўнасці.
2 Роля і месца культуры Беларусі ў агульнаеўрапейскай культурна-цывілізацыйнай прасторы ў Новы час.
3 Праблема ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, яго этнічная прыналежнасць.
4 Месца і роля ВКЛ у гісторыі Еўропы.
5 Наваградак – цэнтр беларуска-літоўскай дзяржавы.
6 Атрыбуты адноснай самастойнасці ВКЛ у сістэме Рэчы Паспалітай.

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*
1 Выдатныя дзеячы беларускага Адраджэння: Ф. Скарына, М. Гусоўскі, С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Сапега.
2 Дзейнасць ордэна базыльян.
3 Таварыства Ісуса (езуіты) – каты беларускага народу або носьбіты еўрапейскай культуры.
4 Этнічная структура насельніцтва Беларусі ў XVI–XVIII стст.
5 Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі.
6 Т. Касцюшка – нацыянальны герой ЗША, Польшчы, Беларусі.

*Літаратура:* [1, с. 16-27, 37-55, 68-118; 2, с. 51-110, 1119-156; 3, т. 1, с. 72-127, 158-243; 4, с. 14-16, 19-35, 45-88; 6, т. 1, с. 92-191, 201-266; 7, с. 24-41; 8, с. 56-98, 119-154; 9, ч. 1, с. 39-52, 58-185; 10; 25].

**Тэма 3. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917г.)**

1 Палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі.
2 Вайна 1812 года на тэрыторыі Беларусі.
3 Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг.: асаблівасці іх правядзення ў Беларусі.
4 Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага.
5 Узнікненне агульнарасійскіх і беларускіх партый. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.

6 Прычыны і характар Першай сусветнай вайны. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Падзеі ў Беларусі (1914 – 1917 гг.).

*Пытанне да дыскусіі:*

1 Палітыка Расіі ў адносінах да беларускіх зямель і насельніцтва.
2 Паўстанне 1863 г. і Беларусь.
3 Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі.

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*

1 Падзеі вайны 1812 г.
2 К. Каліноўскі: палітычны партрэт.
3 Палітычныя партыі Расіі і Беларусі ў пачатку XX ст.
4 Роля і значэнне рэвалюцыі 1905–1907 гг.
5 Нацыянальнае пытанне на Беларусі.

*Літаратура:* [1, с. 119-177; 2, с. 157-243; 3, т. 1, с. 246-368; 4, с. 89-169, 189-304; 6, т. 1, с. 267-328, 357-467; 7, с. 42-54; 8, с. 156-235; 9, ч. 1, с. 187-226; ч. 2, с. 10-39, 62-94; 10; 14; 15].

**Тэма 4. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.)**

1 Кастрычніцкая рэвалюцыя (Кастрычніцкі пераварот) і ўсталяванне Савецкай улады ў Беларусі. Барацьба з германскімі і польскімі інтэрвентамі.
2 Усебеларускі нацыянальны з’езд (снежань 1917 г.). Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.
3 Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове: стварэнне БССР.
4 Асаблівасці ажыццяўлення НЭПа, індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР.
5 Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР і яе асноўныя характарыстыкі.
6 Станаўленне і развіццё савецкай беларускай культуры: дасягненні і супярэчнасці (1919–1941 гг.).

*Пытанні да дыскусіі:*

1 У чым вы бачыце палітычныя пралікі дзеячаў БНР?
2 Савецкая мадэль мадэрнізацыі БССР на этапе станаўлення індустрыяльнага грамадства.
3 Брэсцкая і Рыжская дамовы у гістарычных лёсах беларускага народа.

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*

1 Гістарычныя асобы: Антон і Іван Луцкевічы, Я. Варонка, П. Крэчаўскі, А. Смоліч, Б. Тарашкевіч, З. Жылуновіч, А. Мяснікоў, А. Чарвякоў.
2 Шляхі і метады правядзення калектывізацыі ў БССР.

*Літаратура:* [1, с. 178-222; 2, с. 244-270, 279-300; 3, т. 2, с. 7-178; 4, с. 305-474; 6, т. 2, с. 8-213; 7, с. 55-69; 8, с. 236-300; 9, ч. 2, с. 95-151; 10; 13; 20].

**Тэма 5. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе польскай дзяржавы**

1 Вынікі Першай сусветнай вайны. Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.
2 Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лёсе беларускага народа.
3 Грамадска-палітычнае, эканамічнае і нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
4 Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст.

*Пытанне да дыскусіі:*

1 Жыццё беларусаў па абодва бакі граніцы паміж СССР і Польшчай.
2 Геапалітычнае становішча Беларусі ва ўмовах нарастання пагрозы Другой сусветнай вайны.

*Тэма рэфератыўных паведамленняў:*

1 Параўнальны аналіз эканамічнага і культурнага развіцця беларускага народа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).

*Літаратура:* [1, с. 223-229; 2, с. 271-278, 301-329; 3, т. 2, с. 179-205; 4, с. 475-497; 6, т. 2, с. 214-264; 7, с. 70-77; 8, с. 301-308; 9, ч. 2, с. 153-167; 10].

**Тэма 6. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны**

1 Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
2 Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі летам 1941 года.
3 Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць калабарацыяністаў.
4 Партызанская і падпольная барацьба беларускага народа ў гады вайны.
5 Вызваленне Беларусі. Заканчэнне і вынікі Другой Сусветнай вайны.

*Пытанне да дыскусіі:*

1 Вытокі патрыятызму беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
2 Геапалітычнае становішча Беларусі ва ўмовах нарастання пагрозы Другой сусветнай вайны.

*Тэма рэфератыўных паведамленняў:*

1 Дзейнасць партызан і падпольшчыкаў у рэгіёнах Беларусі.

*Літаратура:* [1, с. 230-256; 2, с. 330-364; 3, т. 2, с. 199-254; 4, с. 498-542; 6, т. 2, с. 265-323; 7, с. 78-90; 8, с. 311-342; 9, ч. 2, с. 169-188; 10; 12; 17].

**Тэма 7. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа (1945–1991 гг.)**

1 Асноўныя рысы грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў другой палове 1940-х – першай палове 1980-х гг.
2 Эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове 1940-х – першай палове 1980-х гг.
3 Здабыткі і негатыўныя з'явы ў развіцці адукацыі, навукі і культуры ў 1950-я – 1980-я гг.
4 Палітыка перабудовы, яе змест і шляхі ажыццяўлення.

*Пытанні да дыскусіі:*

1 Чаму да сярэдзіны 80-х гг. тэмпы прыросту нацыянальнага даходу БССР былі вышэйшыя за агульнасаюзныя?
2 Як была звязана эканоміка з ваенна-прамысловым комплексам?

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*

1 Цяжкасці развіцця сельскай гаспадаркі ў пасляваенныя гады.
2 Асоба П. М. Машэрава.

*Літаратура:* [1, с. 257-280; 2, с. 365-429; 3, т. 2, с. 257-349; 4, с. 543-585; 6, т. 2, с. 324-476; 7, с. 91-108; 8, с. 344-397; 9, ч. 2, с. 189-227; 10; 19; 23].

**Тэма 8. Рэспубліка Беларусь ў канцы XX – пачатку XXI ст.**

1 Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР і БССР. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
2 Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь у 1992–2014 гг.
3 Асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.
4 Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь. Выпрацоўка стратэгіі і прынцыпаў знешняй палітыкі, яе шматвектарнасць.
5 Культура Беларусі на сучасным этапе. Роля і дзейнасць нацыянальных супольнасцей Беларусі.

*Пытанні да дыскусіі:*

1 Дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь як вызначальная каштоўнасць сучаснай беларускай нацыі.
2 Сутнасць сучаснага этапу мадэрнізацыі беларускага грамадства.
3 Фарміраванне прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь: заканамернасці і асаблівасці.
4 Мадэрнізацыя нацыянальнай сістэмы адукацыі: праблемы, дасягненні і перспектывы.
5 Узаемаадносіны дзяржавы і царквы ў Рэспубліцы Беларусь.
6 Глабалізацыя і сучасны свет: праблемы і спробы іх вырашэння.

*Тэмы рэфератыўных паведамленняў:*
1 Перадумовы распаду СССР.
2 Праблемы дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі на сучасным этапе.
3 На шляху да інтэграцыі Расіі і Беларусі.

*Літаратура:* [1, с. 281-302; 2, с. 430-460; 3, т. 2, с. 350-426; 4, с. 574-578, 586-613; 5; 6, т. 2, с. 477-511; 7, с. 109-127; 8, с. 401-447; 9, ч. 2, с. 229-239; 10; 16; 24].

## 3 Планы семінарскіх заняткаў для замежных студэнтаў

### Тема 1. Исторические этапы формирования беларуского этноса (VI ст. – начало XX ст.)

1 Население на территории Беларуси в эпоху каменного, бронзового и раннего железного века. Расселение славян.
2 Основные концепции происхождения беларуского народа и названия “Белая Русь”. Формирование беларуской народности.
3 Введение христианства. Роль религии в консолидации беларуского этноса.
4 Этническое самосознание и менталитет беларусов. Духовная жизнь беларуских земель в IX–XVIII вв.
5 Развитие беларуского этноса в XIX ст. Национальное самосознание беларусов.
6 Идеи беларуского национального возрождения в начале XX ст.

*Литература:* [1, с. 4-19, 28-36, 56-59, 151-154; 2, с. 16-44, 111-118, 234-243; 3, т. 1, с. 17-41, 128-155, 369-391; 4, с. 3-18, 36-44, 170-188: 6, т. 1, с. 9-91, 166-177, 192-200, 329-356; 7, с. 4-23; 8, с. 5-55, 99-116, 179-183, 217-224; 9, ч. 1, с. 7-37, 53-56, 104-125; ч. 2, с. 41-60; 10; 21].

### Тема 2. Государственные образования на беларуских землях в IX – XVIII вв.

1 Становление раннефеодальных государственных образований восточных славян. Полоцкое и Туровское княжества в IX–XIII вв.
2 Предпосылки и процесс формирования Великого Княжества Литовского. Особенности формирования государственного строя и социально-экономического уклада на беларуских землях ВКЛ.
3 Люблинская уния и образование Речи Посполитой. Беларуские земли после Люблинской унии.
4 Внешняя политика Речи Посполитой. Войны XVII–XVIII вв. и их последствия для Беларуси.
5 Основные тенденции и достижения в развитии культуры Беларуси в эпохи Возрождения, Реформации и Просвещения.

6 Экономическое и политическое состояние беларуских земель в XVII–XVIII вв. Причины кризиса и три раздела Речи Посполитой. Восстание 1794 г. под руководством Т.Костюшки.

*Литература:* [1, с. 16-27, 37-55, 68-118; 2, с. 51-110, 1119-156; 3, т. 1, с. 72-127, 158-243; 4, с. 14-16, 19-35, 45-88; 6, т. 1, с. 92-191, 201-266; 7, с. 24-41; 8, с. 56-98, 119-154; 9, ч. 1, с. 39-52, 58-185; 10; 25].

**Тема 3. Положение белорусских земель в составе Российского государства (конец XVIII ст. – октябрь 1917г.)**

1 Политическое и социально-экономическое положение беларуских земель в составе Российской империи.
2 Война 1812 года на территории Беларуси.
